Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.
30 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №123 (28487)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Чым здзіўляе «Песня года»?**

СТАР. 5



**Вёска знікла. Помнік застаецца**

СТАР. 13



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Аляксандр ГОРВАЛЬ, начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва:**

*«Каля 4,5 тысячы кватэр і жылых памяшканняў плануецца пабудаваць у 2017 годзе ў краіне для шматдзетных сем'яў. Згодна з рашэннем урада па планаванні будаўніцтва жылля на 2017 год асноўная ўвага ўдзелена менавіта шматдзетным сем'ям. Мы арыентуем выканкамы на тое, каб не толькі выканаць, але і перавыканаць гэтае заданне, для таго каб паменшыць чарговасць шматдзетных сем'яў. Дарэчы, на пачатак гэтага года на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў у нас было 30,5 тысячы шматдзетных сем'яў, з іх каля 7 тысяч стаяць на ўліку больш за 3 гады».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.06.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9336 | ▼ |
| Еўра | 2,2088 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0740 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# У Альшанцы вырас сад





Сучасны дзіцячы садок адкрыўся ў новым густанаселеным гродзенскім спальным раёне Альшанка. Пабудаваны ён па тыпавым праекце: трохпавярховы будынак зможа змясціць 12 груп — 230 дзяцей. Аднак пры неабходнасці колькасць месцаў можа быць павялічана. Тут створаны ўсе ўмовы для гарманічнага выхавання дзяцей. У будынку ёсць гульнявыя і спальныя памяшканні, спартыўныя і музычныя залы, камп'ютарны клас і басейн.

Фота БЕЛТА.

■ IV Форум рэгіёнаў

## СУСВЕТНЫ ЎЗРОВЕНЬ

Выстаўка інавацыйных дасягненняў у Маскве прадэманстравала канкурэнтаздольнасць беларускай і расійскай прадукцыі



Фота БЕЛТА.

**Ад электробуса і робататэхнікі да медыцыны і інфармацыйных тэхналогій. Выстаўка ў рамках IV Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі была ўрачыста адкрыта спікерамі верхніх палат парламентаў Беларусі і Расіі Міхаілам МЯСНІКОВІЧАМ і Валянцінай МАЦВІЕНКАЙ.**

«У нашых эканомік добрыя перспектывы, — заявіў пасля адкрыцця экспазіцыі старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мяснікові́ч. — Усе тэхналогіі, што дэманструюцца на выстаўцы, маюць найвышэйшы сусветны ўзровень. Такім чынам, мы можам казаць не толькі пра імпартазамяшчэнне, але і пра тое, што мы канкурэнтаздольныя і можам упэўнена адчуваць сябе на сусветных рынках. Хачу заўважыць, што эканомікі нашых краін усё больш інвеснуюць у сумесныя вытворчасці. Аб'емы такіх інвестыцый вымяраюцца мільярдамі долараў у год».

СТАР. 2

■ ЦТ—2017

## АПОШНІ ШАНЦ СТАЦЬ СТУДЭНТАМ

**Рэгістрацыя абітурыентаў для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні ў рэзервовы дзень будзе праводзіцца з 30 чэрвеня па 3 ліпеня. З сабой трэба мець пропуск на тэсціраванне, якое было прапушчана, дакумент, які сведчыць асобу абітурыента, і дакумент, які пацвярджае ўважлівую прычыну няяўкі.**

Істотным плюсам новых Правілаў прыёму можна лічыць з'яўленне трох рэзервовых дзён для здачы ЦТ: сёлета гэта 6, 8 і 10 ліпеня. Раней быў прадугледжаны ўсяго адзін такі дзень, і, калі абітурыент захварэў і прапусціў, напрыклад, два ЦТ, ён вымушаны быў страчваць цэлы год. Да таго ж спартсмены маглі прапусціць здачу ЦТ з-за важных спаборніцтваў, музыканты — з прычыны ўдзелу ў фестывалях і г. д. Цяпер у іх будзе магчымасць скарыстацца рэзервовымі днямі. Канкрэтнага пераліку ўважлівых прычын няма, кожны выпадак разглядаецца індывідуальна. Напрыклад, страта пашпарта лічыцца ўважлівай прычынай, але ўсё роўна трэба мець даведку, якая пацвярджае гэты факт.

СТАР. 3



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

# СУСВЕТНЫ ЎЗРОВЕНЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Старшыня Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі назвала Форум рэгіёнаў важным складнікам у адносінах дзвюх краін. «Форумы рэгіёнаў Расіі і Беларусі выконваюць істотную ролю ў справе пашырэння міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, развіцця расійска-беларускага ўзаемадзеяння», — сказала Валянціна Мацвіенка. Яна адзначыла, што на выстаўцы прадстаўлены дзясяткі найлепшых узораў высокатэхналагічнай прадукцыі, у тым ліку ў сферы электратранспарту і металургіі. «Менавіта такія тавары складаюць аснову канкурэнтаздольнасці эканомік дзвюх дзяржаў», — падкрэсліла спікер верхняй палаты расійскага парламента.

Усе экспанаты, што прадставілі беларусы ў Маскве, можна ўмоўна падзяліць на блокі: тыя, што створаны ў рамках беларуска-расійскай кааперацыі, і тыя, дзе айчынныя навукоўцы выкарыстоўваюць свае распрацоўкі, дзе айчынныя навукоўцы вынайшлі ўнікальныя тэхналогіі. Наведвальнікі на свае вочы пераканаліся, што кожны стэнд незалежна ад тэматыкі дэманструе навінкі, да якіх пасуюць слова «ўнікальны».

Усяго на выстаўцы сваю прадукцыю прадставілі больш за 60 беларускіх прадпрыемстваў. «Гэта мэтавая выстаўка, якая паказвае менавіта нашы прарыўныя распрацоўкі», — растлумачыла **віцэ-спікер Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Мар'яна ШЧОТКІНА.** Яна звярнула ўвагу на маладзёжны складнік падзеі і агучыла прапанову пашырыць праект «100 ідэй для Беларусі» да межаў Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

Форум рэгіёнаў заўжды вылучаўся хуткімі вынікамі. Ужо ў рамках выстаўкі былі падпісаны шэраг пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж беларускімі і расійскімі рэгіёнамі. Акрамя таго, былі заключаны кантракты на пастаўку беларускай прадукцыі ў Расію. Сярод іх — пагадненне на пастаўку кар'ернай тэхнікі БелАЗам на Сахалін, дагавор на пастаўку прадукцыі Гродзенскага мясакамбіната, а таксама швейных вырабаў Баранавіцкага вытворчага баваўнянага аб'яднання ў Маскву. Паралельна з выстаўкай праходзіў кірмаш, на якім удзельнікі Форуму і масквічы маглі прадэгуставаць і набыць беларускія харчовыя прадукты, купіць адзенне і іншыя тавары.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*
*г. Масква, Расія.*



Фота БЕЛТА.

**❍ У тэму**

**Леанід ЗАЯЦ, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі:**

— Павінны быць адзіныя падыходы ў вызначэнні якасці прадукцыі. Маю на ўвазе астаткавую колькасць ветпрэпаратаў і антыбіётыкаў у ёй. Мусіць быць зразумела і аднаму, і другому боку, якімі прынцыпамі варта кіравацца, каб гарантаваць пастаўку бяспечнай прадукцыі на рынкі Саюзнай дзяржавы. Мы хочам, каб прадукцыя з беларускіх прадпрыемстваў паступала на харчовыя рынкі без пэўных абмежаванняў. Бо наша прадукцыя адпавядае ўсім крытэрыям бяспекі. Яна пастаўляецца больш чым у 60 краін, што пацвярджае яе высокі якасны ўзровень. У Мытным кодэксе ніякіх абмежаванняў аб астаткавай колькасці ветпрэпаратаў і антыбіётыкаў няма. Але ёсць дапушчальныя нормы, якія не з'яўляюцца шкоднымі для здароўя чалавека. Мы ў стане адсачыць кожны прадукт на прадмет яго бяспечнасці. У нас працуюць акрэдытаваныя лабараторыі, арганізавана шматступеньчатая сістэма кантролю якасці прадукцыі — ад сыравіны да канчатковага прадукту.

# На новыя рынкі

## Сумесная вытворчасць МАЗа з В'етнамам запрацуе ў лістападзе

**Дэлегацыя на чале з намеснікам прэм'ер-міністра В'етнама Фам Бінь Мінем азнаёмілася з мадэльным радам тэхнікі Мінскага аўтазавода. Акрамя таго, гасцям паказалі і іншыя распрацоўкі вядучых прамысловых прадпрыемстваў краіны: МТЗ, «Амкадора», ММЗ, «Мотавела» і «Гомсельмаша».**

Асаблівую цікавасць госці праявілі да тых мадэляў, што ўжо адпавядаюць умовам эксплуатацыі ў В'етнаме. Ад МАЗа гэта былі аўтобусы невялікай ёмістасці, ад МТЗ — трактары, якія ўжо былі дапрацаваны па заяўках заказчыка. Гаворачы аб тэхніцы МАЗа, намеснік прэм'ер-міністра В'етнама падкрэсліў, што рашэнне аб стварэнні сумеснага прадпрыемства ў В'етнаме з'яўляецца выйгрышным крокам для ўсіх бакоў, бо гэтая тэхніка ў яго краіне даўно ўжо карыстаецца папулярнасцю. Для дэлегатаў важным з'яўляецца таксама і тое, што беларускі бок абавязаўся займацца лакалізацыяй вытворчасці. Гэта азначае, што в'етнамскія прадпрыемствы змогуць вырабляць камплектуючыя для сваіх МАЗаў самастойна. Чакаецца, што ўзровень лакалізацыі да 2020 года дасягне 40%. Нашай краіне гэта дазволіць бяспошлінна прадаваць беларускія грузавікі як у В'етнаме, так і ў 9 іншых краінах АСЕАН. **Генеральны дырэктар МАЗа Дзмітрый КАЦЯРЫНІЧ** растлумачыў, што беларуская доля статутнага фонду ў сумесным прадпрыемстве складае 30%. Пры гэтым мы дзелімся тэхналогіямі і прадукцыяй. За свае 70% азіяцкія партнёры праінвеставалі стварэнне прадпрыемства.

«Мы вывучылі рынак, правялі маркетынгавыя даследаванні і разам з нашымі в'етнамскімі партнёрамі абралі тыя мадэлі тэхнікі, якія неабходныя ў першую чаргу. У В'етнаме ўведзены новы стандарт, які патрабаваў змяніць габарыты нашай тэхнікі. Таму прыйшлося распрацаваць адмысловыя мадэлі для рынку АСЕАН і палепшыць іх дызайн. Акрамя таго, мы правялі вялікую работу, каб зрабіць айчынную тэхніку канкурэнтнай па цане. Будаўніцтва завода ўжо вядзецца. Мы плануем, што сумеснае прадпрыемства будзе гатова да верасня. Зборачная вытворчасць павінна запусціцца ў лістападзе», — адзначыў гендырэктар МАЗа.

Да гэтага часу Мінскі аўтазавод адправіць у В'етнам 200 гатовых грузавікоў і аналагічную колькасць машынакамплектаў на агульную суму ў 18,1 млн долараў. Кантракт быў падпісаны ў Мінску. Дзмітрый Кацярыніч адзначыў, што гэты дакумент, безумоўна, мае вялікае значэнне для прадпрыемства. «Але куды важней, што наяўнасць сумеснага прадпрыемства і падпісанага пратакола аб садзейнічанні ў вытворчасці маторных транспартных сродкаў, які стаў часткай пакета пагадненняў аб зоне свабоднага гандлю паміж ЕАЭС і В'етнамам, заклала аснову для экспартных паставак аўтатэхнікі МАЗа. Прычым беларускім машынабудаўнікам можна пастаўляць сваю тэхніку ў В'етнам бяспошлінна. В'етнамскі рынак у прыватнасці, як і рынак АСЕАН у цэлым, адзін з найбольш абароненых. Вялікай перамогай з'яўляецца атрымаць такую прэферэнцыю для МАЗа. Акрамя таго, на працягу пяці гадоў мы зможам бяспошлінна экспартаваць яшчэ каля 4 тысяч камплектаў», — паведаміў гендырэктар МАЗа.

Пастаўкі беларускай тэхнікі будуць расці з кожным годам. У 2018-м МАЗ плануе адправіць у В'етнам каля 1000 грузавікоў. У 2019-м гэта колькасць узрасце да 1300 адзінак. «У сярэднім у В'етнаме плануецца штогод збіраць каля тысячы грузавікоў на суму больш за 40 млн долараў. Гэты рынак стане для нас адным з перспектыўных у Паўднёва-Усходняй Азіі», — дадаў Дзмітрый Кацярыніч.

Падчас сустрэчы з в'етнамскімі партнёрамі абмяркоўвалася пытанне стварэння другога сумеснага прадпрыемства па зборцы аўтобусаў. Напярэдадні былі зняты ўсе стрымліваючыя фактары. Ёсць надзея, што ў найбліжэйшы час будзе падпісана адпаведнае пагадненне. «Там плануецца выпускаць аўтобусы невялікай ёмістасці спецыяльна для вялікіх гарадоў. Вывучыўшы рынак, мы прынялі рашэнне, што аўтобусаў такога класа будзе рабіцца да 500 адзінак у год на агульную суму больш за 50 млн долараў», — рэзюмаваў Дзмітрый Кацярыніч.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

## СУБОТНІ ІНТЭРАКТЫЎ

**Ва ўсіх рэгіёнах краіны 1 ліпеня пройдуць рэгулярныя прамыя тэлефонныя лініі з уладамі. Тысячы пытанняў і не менш адказаў. Некаторыя праблемы кіраўнікі вырашаюць не паклаўшы трубку тэлефона, іншыя бяруць пад уласны кантроль. Самыя набалелыя просьбы звычайна звязаны з камунальнымі пытаннямі і добраўпарадкаваннем тэрыторый. Пры гэтым расце і колькасць падзяк за праведзеную работу.**

У суботу, 1 ліпеня, тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 праводзяць:

**Брэсцкі аблвыканкам —** намеснік старшыні КЛЕЦ Андрэй Анатолевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам —** намеснік старшыні БЕЛАВУС Уладзімір Мікалаевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам —** кіраўнік спраў КЛІЧКОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам —** намеснік старшыні ЛІСКОВІЧ Віктар Андрэевіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам —** намеснік старшыні ХАРЫТОНЧЫК Дзмітрый Іванавіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам —** кіраўнік спраў ГУРЫНОВІЧ Уладзімір Аляксандравіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам —** першы намеснік старшыні РЫМАШЭЎСКІ Фёдар Віктаравіч (80172224444).

■ Узровень

# БДУ паляпшае сваю пазнавальнасць у свеце

**Белдзяржуніверсітэт упершыню ўвайшоў у адзін з самых прэстыжных сусветных рэйтынгаў — Шанхайскі прадметны рэйтынг універсітэтаў ARWU 2017 года па фізіцы, дзе заняў месца ў групе 401—500.**

Да гэтага часу ні адзін беларускі ўніверсітэт не ўваходзіў у лік універсітэтаў, якія ранжыруюцца Шанхайскім рэйтынгам. Найлепшыя навучальныя ўстановы вызначаюцца на аснове пяці крытэрыяў: прадукцыйнасць навуковай дзейнасці; індэкс цытавання; міжнароднае супрацоўніцтва; матэрыялы, апублікаваныя выкладчыкамі ўніверсітэта ў найбольш прэстыжных навуковых часопісах; наяўнасць навуковых узнагарод і прэмій міжнароднага ўзроўню.

Шанхайскі прадметны рэйтынг універсітэтаў ARWU змяшчае ацэнкі ўніверсітэтаў па 52 прадметах, уключаючы прыродазнаўчыя, інжынерна-тэхнічныя, грамадскія навукі, медыцыну і іншыя. Усяго ў даследаванні былі ацэнены больш за чатыры тысячы ўніверсітэтаў. Сярод расійскіх ВНУ самы высокі вынік — у МДУ імя М. Ламаносава, які заняў у рэйтынгу па фізіцы 43-е месца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by* ■

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### СМІ паведамілі аб адмене візіту прэзідэнта Бразіліі на саміт G20



Прэзідэнт Бразіліі Мішэль Тэмер адмяніў візіт на саміт G20, які адбудзецца 7—8 ліпеня ў Гамбургу, паведаміла выданне UOL са спасылкай на заяву прэс-службы бразільскага лідара.

Афіцыйная прычына адмены паездкі не названа. Аднак адзначаецца, што гэта можа быць звязана з палітычным крызісам у Бразіліі.

UOL дадае, што Тэмер не можа пакідаць краіну ў той момант, калі ў парламенце будуць разгледжаны абвінавачанні супраць яго.

Раней, 27 чэрвеня, генеральны пракурор Бразіліі Радрыга Жанот афіцыйна вылучыў абвінавачанні супраць Мішэля Тэмера. Бразільскага лідара абвінавацілі ў карупцыі. Пракурор звярнуўся ў Федэральны вярхоўны суд краіны з запытам аб прад'яўленні абвінавачанняў у карупцыі прэзідэнту. На думку пракурора, Тэмер і яго былы дарадца Радрыга Роша Лоўрэс «падмянілі выкананне найважнейшых абавязкаў дзяржслужачых незаконнымі дзеяннямі», якія «выконваліся ў іх асабістых інтарэсах».

### Трамп сабраў за адзін вечар $10 млн на сваю будучую выбарчую кампанію

Па словах прэс-сакратара Нацыянальнага камітэта Рэспубліканскай партыі Ліндсі Джэнсік, на вячэры, якая праходзіла ў вашынгтонскім гатэлі Trump International, прысутнічалі 300 чалавек.

Білет на двухгадзіннае мерапрыемства абышоўся кожнаму з гасцей у $35 тыс. AP таксама адзначае, што банкет прыцягнуў увагу палітычных апанентаў Трампа. Перад будынкам сабраліся некалькі дзясяткаў актывістаў, якія трымалі плакаты з надпісамі «Ахова здароўя, а не скарачэнне падаткаў» і скандавалі: «Ганьба!»

Агенцтва адзначае, што амерыканскі прэзідэнт парушыў традыцыю сваіх папярэднікаў, не дапусціўшы рэпарцёраў на мерапрыемства. Паводле яго даных, спачатку журналістам абяцалі, што яны змогуць прысутнічаць у зале падчас выступлення Трампа, аднак пазней арганізатары передумалі і не дапусцілі туды прадстаўнікоў прэсы.

Збор сродкаў цяперашнім прэзідэнтам пачаты незвычайна рана, амаль за 3,5 года да наступных выбараў.

### Памёр прадзюсар «Проста Марыі» і «Дзікай Ружы» Валянцін Пімштэйн, выхадзец з Беларусі

Вядомы мексіканскі прадзюсар Валянцін Пімштэйн, стваральнік папулярных серыялаў «Проста Марыя», «Багатыя таксама плачуць» і «Дзікая Ружа», памёр ва ўзросце 91 года. Пра гэта паведамляе JTA са спасылкай на мексіканскае тэлебачанне.

Пімштэйн быў адным з заснавальнікаў жанру шматсерыйнай меладрамы і стваральнікам больш як 100 тэлесерыялаў. Менавіта ён у 1970-х звярнуў увагу на меладраматычныя аповесці Інэсы Радэны, якія леглі ў аснову 249-серыйнага тэлефільма «Багатыя таксама плачуць».

Пімштэйн нарадзіўся ў 1925 годзе ў Сант'яга, сталіцы Чылі. Бацькі Пімштэйна нарадзіліся ў Мінску. Па адной інфармацыі, яны беглі з будучай сталіцы Беларусі пасля яўрэйскіх пагромаў, па другой — пасля рэвалюцыі 1917 года. Пімштэйны эмігравалі ў Мексіку, а ў 1925 годзе адправіліся на адпачынак у Чылі, дзе і з'явіўся на свет будучы тэлепрадзюсар.

ГОМЕЛЬСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ УНП 400178549
вносит изменения в объявление о проведении торгов о сдаче в аренду рыболовных угодий фонда запаса, вышедшего в номере от 21 июня 2017 г., следующего содержания:
«Задаток составляет: сумма ежегодной арендной платы заявленного участка»

Утеряна круглая печать ООО «ВАК групп», г. Минск, УНП 191141295, в связи с чем считать ее недействительной. Тел. 8 029 6151520

Утеряно свидетельство о государственной регистрации юридического лица за номером в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 491325376 от 14.11.2016 и печать Общества с ограниченной ответственностью «ДХБел Плюс». В связи с утратой свидетельства и печати организации просим считать их недействительными

■ Святочнае

# ШТОВЕЧАР ЛЯ ПАЛАЦА

## Да Дня Незалежнасці ў Гродне праходзіць канцэртны марафон

**На працягу тыдня лепшыя калектывы вобласці выступаюць на летняй сцэне цэнтральнай плошчы горада. Праграма доўжыцца з 18 да 22 гадзін.**

Савецкая плошча на гэтым тыдні выглядае па-асабліваму ўтульна і ажыўлена. Гродзенцы прыходзяць сюды вечарамі, каб атрымаць асалоду ад выступлення калектываў, якія маюць званні «народны», «заслужаны», «узорны». Усяго да Дня Незалежнасці выступяць 400 калектываў з усіх раёнаў вобласці.

— Артысты рады выступіць на абласной сцэне, — задаволена **дырэктар Цэнтра культуры Воранаўскага раёна Ірына КАМІНСКАЯ.** — У некаторых калектывах, як напрыклад, у «Лявонаў», змяніўся склад ансамбля, і некаторыя яшчэ ў абласны цэнтр з канцэртам не выязджалі.

Удзельнікам канцэртаў імпануе, што на плошчы збіраецца нямала гледачоў. Гродзенцы прыходзяць сем'ямі, многія размяшчаюцца ў крэслах каля сцэны ці за столікамі летняга кафэ.

— Наш марафон мы назвалі «Талентаў россып — да Свята краіны», — расказала **вядучы метадыст абласнога метадычнага цэнтра Святлана ДУБРОЎСКАЯ.** — Ён праходзіць упершыню і прысвечаны аднаму з найважнейшых дзяржаўных свят — Дню Рэспублікі Беларусь. Многія вакальныя нумары выконваюцца на беларускай мове, танцы ў асноўным народныя. Гэта прэстыжна — прыняць удзел у такім марафоне.



Таксама на плошчы працуе інтэрактыўная дзіцячая пляцоўка і выстаўка-продаж выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Трэба адзначыць, што Савецкая плошча паступова набывае статус культурнага цэнтра Гродна. Тут пачаўся летні музычна-турыстычны сезон канцэртаў «Нядзеля ля Палаца».

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

■ Надвор'е

# У наступныя дні — дажджы і навальніцы

**Аранжавы ўзровень небяспекі з-за навальніц і шквалістага ветру абвешчаны ў краіне сёння, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Умовы надвор'я сёння будуць вызначаць актыўныя атмасферныя франты, якія перамяшчаюцца з паўднёвага захаду Еўропы. На большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, навальніцы, пераважна па ўсходняй палове краіны ў асобных раёнах — град і моцныя лівні. Вецер паўднёва-заходні парывісты, пры навальніцах месцамі моцны шквалісты. Тэмпература паветра ноччу складзе 15—21 градус цяпла, днём чакаецца ад 23 да 28 градусаў вышэй за нуль, па паўднёвым усходзе паветра прагрэецца да плюс 32 градусаў.

Першыя дні ліпеня ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны таксама будуць вызначаць франтальныя раздзелы, якія перамяшчаюцца з паўднёвага захаду Еўропы. Ноччу ў асобных раёнах, а днём на большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра 1 ліпеня ўначы складзе 13—18 градусаў цяпла, удзень — 18—25 градусаў вышэй за нуль, па паўднёвым усходзе будзе да плюс 27. 2 ліпеня начныя тэмпературы будуць вагацца ад 11 да 16 градусаў цяпла, днём слупок тэрмометра будзе паказваць 18—25 градусаў вышэй за нуль.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■

# ГОРАД СЯБРОЎСТВА, ГОРАД МІРУ!

## Бабруйск адзначае 630-ы дзень нараджэння і прымае гасцей міжнароднага фестывалю «Вянок дружбы»

**У гэтыя дні на вуліцах культурнай сталіцы 2017-га асабліва прыгожа і ўтульна. І тым, хто завітае сюды на свята, лепш за ўсё пачынаць знаёміцца з горадам з выстаўкі заслужанага мастака Расійскай федэрацыі Абрама Рабкіна «Стары Бабруйск. Вяртанне на Радзіму», якая адкрылася ўчора ў мастацкім музеі. Бо паміж горадам, якім ён быў і якім стаў — вялікая розніца.**



Сёння на лядовай «Бабруйск-арэне» адбудзецца галоўная падзея свята — урачыста адкрыецца Міжнародны фестываль народнай творчасці «Вянок дружбы». Яго ўдзельнікамі сталі 30 калектываў і выканаўцаў з 24 краін. У гасцінны Бабруйск завіталі прадстаўнікі Беларусі, Расіі, Украіны, Азербайджана, Сербіі, Балгарыі, Венгрыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Ізраіля, Іспаніі, Італіі, Калумбіі, Кіпра, Кубы, Латвіі, Мексікі, Малдовы, Нарвегіі, Польшчы, ЗША, Славакіі, Турцыі, Чэхіі. Сярод ганаровых гасцей фестывалю Вера Найдзіч — член баварска-рускага культурнага таварыства, кіраўнік гуртка вязання, макрамэ, ірландскіх карункаў, пацеркавага мастацтва, аўтар шматлікіх вершаў і прозы.

На плошчы Леніна і прылеглай да яе тэрыторыі на працягу некалькіх дзён будуць праходзіць канцэрты, тэатральныя прадстаўленні, выстаўкі-продажы і нават запрацуе кухня пад адкрытым небам. Фестываль ежы ад кіраўнікоў бабруйскіх прадпрыемстваў «Запрашаем смачна есці» ўжо стаў традыцыйным на свята горада. У рамках фестываля пройдзе выстаўка-кірмаш народных умельцаў «Горад майстроў», у якой прымуць удзел каля паўтысячы рамеснікаў з Беларусі і Украіны. Упершыню пройдзе фестываль вулічных тэатраў.

Як адзначыў **начальнік упраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага гарвыканкама Мікалай БАЛЮК,** гісторыя не раз даказвала, што найбольш трывалыя масты дружбы паміж народамі ўзводзяцца праз культурнае супрацоўніцтва. Народная дыпламатыя, народныя песні і танцы не ведаюць межаў. І ў год свайго 630-годдзя Бабруйск, які з гонарам нясе сёлетні статус «Культурная сталіца Рэспублікі Беларусь», праводзіць пад міралюбівым небам Беларусі фестываль дружбы «За мір і згоду без межаў». Мова мастацтва і творчасці не патрабуе перакладаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■

■ Смак лета

# Клубніцы сёлета парадавалі

**Сезон клубніц у Лунінецкім раёне працягнецца яшчэ каля тыдня.**

Сёлета, у параўнанні з мінулым годам, ураджай гэтай салодкай ягады выдаўся вельмі добрым. Па словах эканаміста Лунінецкага раённага спажывецкага таварыства Аксаны Сайко, згодна з апошняй інфармацыяй, нарыхтавана ўжо 195 тон клубніц. Для параўнання: у мінулым годзе на тую самую дату ў «актыве» было 119,9 тоны ягад, а за ўвесь леташні сезон атрымалася нарыхтаваць 123,1 тоны клубніц. У ліку 195 тон — 7,2 тоны адборнай, «калібраванай» ягады. Як расказала далей Аксана Пятроўна, зараз штодня на адвозцы нарыхтаваных клубніц на перапрацоўчыя прадпрыемствы занятыя ад 14 машын і больш. Закупачныя цэны на таварную ягаду — да двух рублёў (1,5—1,6, 1,7—1,8 рубля). Клубніцы для кансервавай галіны ў скрыні прымаюць па 50 капеек, для вінаробства ў бочкі — па 30 капеек.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■

# АПОШНІ ШАНЦ СТАЦЬ СТУДЭНТАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Таксама тры рэзервовыя дні для правядзення ЦТ дадуць шанц паўдзельнічаць у конкурсе на бюджэтныя месцы абітурыентам з Расіі, Казахстана, Кыргызстана і Таджыкістана, якія не паспявалі прыехаць у Беларусь у чэрвені, каб здаць ЦТ разам з беларусамі, паколькі ў гэты ж час яны здавалі свае нацыянальныя экзамены. У іх была адзіная магчымасць стаць студэнтам беларускай ВНУ — праходзіць субяседаванне восенню і паступаць на платную форму навучання як замежным грамадзянам з адпаведнымі «расцэнкамі» за вучобу.

Але арганізатары ЦТ папярэджваюць: да здачы тэст-іспытаў у рэзервовы дзень будуць допушчаны толькі тыя абітурыенты, якія змогуць даказаць, што ў іх былі сур'ёзныя прычыны для пропуску экзамену, напрыклад, прад'явіць даведку пра сваю хваробу ці дакумент, які пацвярджае іх удзел у гэты момант у важных для краіны спартыўных ці творчых спаборніцтвах. **Пры гэтым абавязковай умовай з'яўляецца наяўнасць рэгістрацыі на ЦТ ва ўстаноўленыя тэрміны — гэта значыць, да 1 чэрвеня бягучага года.** Калі абітурыент у маі знаходзіўся за мяжой і не мог асабіста зарэгістравацца на ЦТ, за яго гэта маглі зрабіць законныя прадстаўнікі або прадстаўнікі абітурыента па падставе завернай натарыяльна даверанасці.

Калі абітурыенты ўдзельнічалі ў ЦТ у асноўны дзень, але не змаглі дапісаць сваю работу з-за пагаршэння стану здароўя, яны таксама змогуць скарыстацца рэзервовым днём. Для аказання абітурыентам медыцынскай дапамогі ва ўсіх пунктах правядзення тэсціравання былі арганізаваныя дзяжурствы медыцынскіх работнікаў, таму такія выпадкі фіксаваліся непасрэдна на месцы.

А вось тыя, хто парушыў правілы ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні, здаць прапушчаны экзамен у рэзервовы дзень не змогуць.

Звяртацца з дакументамі, якія пацвярджаюць прычыну няяўкі на ЦТ, трэба ў Белдзяржуніверсітэт, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт і Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы.

Пунктам правядзення цэнтралізаванага тэсціравання па ўсіх вучэбных дысцыплінах у рэзервовыя дні вызначаны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Турыстам у дапамогу

# ЭКСКУРСАВОД У ТЭЛЕФОНЕ

## З'явіўся новы мабільны гід па Беларусі

**Бясплатную турыстычную праграму для смартфонаў прадставілі тэлерадыёкампанія «Мір» і TopTripTip. З дапамогай мабільнага гіда можна даведацца пра галоўныя славутасці краіны, адкрыць новыя месцы для адпачынку і скласці план падарожжа. Гістарычныя і прыродныя аб'екты, правераныя маршруты, інфраструктура — усё гэта будзе даступна на тэлефоне без падключэння да інтэрнэту.**

У праграме «TopTripTip — Беларусь» можна знайсці рэйтынгі турыстычных мясцін, пралічыць ступень аддаленасці і працягласць маршруту, даведацца аб наяўнасці аўдыяэкскурсіі. Даступныя фільтры для сарціроўкі аб'ектаў па тыпе, папулярнасці і аддегласці.

Інфармацыя размеркавана па тэматычных раздзелах: замкі і палацы, Вялікая Айчынная вайна, музеі. На старонках турыстычных аб'ектаў змешчаны цікавыя факты пра іх, час работы і кантактныя тэлефоны (што датычыцца музеяў). Карты-гіды даступныя ў рэжыме афлайн. У даведніку ёсць таксама рэкамендацыі і маляўнічыя здымкі беларускага краязнаўцы і фатографа, аўтара рэсурсу «Планета Беларусь» Сяргея Плыткевіча.

Праграма шматфункцыянальная: можна запланаваць паездку ў календары, настроіць нагадванне. Створана спецыяльная стужка, куды можна дадаваць уласныя спісы цікавых аб'ектаў. Акрамя таго, гід самастойна абнаўляе анонс падзей, свят і фестываляў у розных кутках Беларусі і паведамляе пра гэта карыстальніку. Тут можна паглядзець надвор'е ў тым месцы, куды збіраешся паехаць.

У гідзе прадстаўлены таксама парады ад тэлеканала «Мір»: славутасці, лайфхакі для падарожнікаў, правераныя журналістамі маршруты.

— Нашы карэспандэнты працуюць ва ўсіх кутках Беларусі. Яны здымаюць вялікую колькасць рэпартажаў і праектаў, матэрыялы з якіх будуць уключаны ў мабільны даведнік, і кожны карыстальнік зможа паўтарыць падарожжа здымачнай групы тэлеканала, — расказвае **дырэктар прадстаўніцтва міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір» у Беларусі Уладзімір ПЯРЦОЎ.** — У цэлым атрымаўся ўніверсальны, зручны і прыгожы дапаможнік, які дакладна спатрэбіцца і падарожніку-навічку, і вопытнаму турысту.

Сёння ў даведніку TopTripTip, акрамя Беларусі, прадстаўлена турыстычная інфармацыя па Грузіі, Арменіі і Казахстане, даступныя гіды па 75 рэгіёнах Расіі. Усе яны пастаянна папаўняюцца новымі аб'ектамі, мерапрыемствамі і маршрутамі. Рыхтуецца мабільны даведнік па ўсіх краінах СНД. Спампаваць праграму можна ў інтэрнэт-крамах AppStore і Google Play.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■

■ Здарэнне

# УЦЕЧКА ГАЗУ ЛІКВІДАВАНАЯ

**У 11.56 ратавальнікам паступіла паведамленне аб прарыве газаправода на будаўнічым прадпрыемстве ў Ваўкавыскім раёне ў гарадскім пасёлку Краснасельскі.**

Калі да месца выкліку прыбылі падраздзяленні МНС, высветлілася, што грузавы аўтамабіль рухаўся праз прахадную завода з паднятым кузавам і пашкодзіў газавую трубу дыяметрам 219 мм, а таксама дзве побач пракладзеныя трубы дыяметрам 150 мм, якія не эксплуатаваліся. З-пад венціля пачалася ўцечка газу.

У выніку пашкоджання газаправода адключылася гарачая вада і газазабеспячэнне ў філіяле завода, а таксама вада ў пасёлку Краснасельскі. Пашкоджаныя тры прыватныя легкавыя аўтамабілі на стаянцы за тэрыторыяй завода.

«Ваўкавыскгазам» была перакрытая засаўка і спыненая падача газу ў трубаправод. Работнікі МНС дзяжурылі дзеля гарантавання пажарнай бяспекі, пакуль вяліся аднаўленчыя работы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■

■ «Звяздзе» — 100 гадоў

# ЯК ДЗЕЦІ ГАЗЕТУ ВІНШАВАЛІ,

## або Юбілей вачамі моладзі



**Векавога юбілею «Звязды» чакаць нядоўга. 9 жніўня наша агульнае свята. І першыя падарункі, ды яшчэ зробленыя сваімі рукамі, найстарэйшая штодзённая газета краіны ўжо пачала прымаць. У Віцебску пастараліся падлеткі. Яны прысвяцілі беларускамоўнаму выданню малюнкі на асфальце.**

### У ПОШУКАХ МАСТАКОЎ

Не маюць рацыі тыя, хто гаворыць, што ініцыятыва караецца. Кіраўніцтва рэдакцыі адразу падтрымала ідэю правядзення конкурсу малюнкаў і выдзеліла грошы на крэйду і прызы пераможцам. Крэйду вырашыў купіць ва ўнівермагу. Што здзівіла, з багатага асартыменту няма айчыннай. Кітайскай, расійскай вытворчасці — калі ласка. Прыйшлося рублём, а дакладней — больш як 10 рублямі, падтрымаць замежных вытворцаў.

А хто ж маляваць будзе? Праз знаёмага выйшаў на каледж, дзе вучаць на мастакія спецыяльнасці. Там ідэю падтрымалі, але папрасілі «даведку-прапанову». Маўляў, каб усё было афіцыйна. Знаёмы прапанаваў яшчэ скласці палажэнне аб конкурсе са складам журы. Паколькі я прынцыповы праціўнік бюракратыі, супрацоўніцтва з каледжам не атрымалася.

Прапанаваў правесці конкурс кіраўніцы дзіцячай мастацкай студыі «Цюбікі» пры Віцебскім мастацкім музеі. Вольга Сяргеева ўжо вырупала, калі святкавалася 95-я гадавіна «Звязды» і праходзіў Год кнігі. Яе выхаванцы тады малявалі на паперы любімых герояў беларускіх казак.

«Саша, ды вы што? Летнія канікулы! Не паспеем!» — пачуў у адказ. Сам вінаваты, трэба было брацца за рэалізацыю ідэі раней.

Сабраць дзятву, якая гуляе ў двары? Трэба будзе кожнаму растлумачыць, а таксама бацькам, потым нагадаць, пацвердзіць удзел — вельмі складана. Няўжо прыйдзецца адмовіцца ад задумы?





Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

### КОЛЬКІ ПАВЕРХАЎ У ДОМЕ ПРЭСЫ?

З цяжкасцю засынаў. Што рабіць з наборамі для малявання? Дзе знайсці канкурсантаў? Раптам мільгнула думка: ёсць жа школьныя лагеры! У СШ №29 імя В. В. Піменава (выпускнік, Герой Савецкага Саюза, ваяваў у Афганістане) ведаю некалькі настаўнікаў. Педагог-арганізатар Анжэла Навікава на момант нашай гутаркі працавала ў прышкольным лагеры працы і адпачынку «Юнацтва». У ім вучні з 8-га і іншых старэйшых класаў. У школе ёсць яшчэ два «летнікі»: «Патрыёт» — ваенна-патрыятычнага кірунку (з 5 па 7 класы) і «Вясёлкавая планета» — для самых маленькіх.

Спачатку з рэдакцыяй вырашылі, што маляваць будуць апошнія. Кніжкі Выдавецкага дома «Звязда» былі адкладзены. Але ж наша мэтавая аўдыторыя — выпускнікі. Прыйшлося «перайграць» яшчэ і наконт новага варыянта прызоў: фірменныя нататнікі і ручкі з эмблемай «Звязды» — добрыя сувеніры. Вырашылі, што іх атрымаюць усе мастакі.

Акцыю лёгка мог сарваць дождж. Ападкі ў Віцебск да таго дня зачасцілі. Але нам пашанцавала. Калі горад рыхтаваўся да святкавання гадавіны свайго заснавання, журналісты і дзеці сустрэліся каля ганка школы. Пастаянны мой суаўтар, фатограф Віктар Нікалаеў здзівіўся таму, што дзеці былі старэйшыя, чым было заяўлена раней. Пакаленне «нэкст» і педагогі ў сваю чаргу прыемна здзівіліся «цудоўнаму» з'яўленню набораў крэйды. Паколькі менавіта ў той дзень у Віцебску збіраліся прэзентаваць скульптуру Хатабыча, я адчуваў сябе яго «вучнем».

І як той казаў, працэс пайшоў. Хлопцам і дзяўчатам спачатку прапанаваў паглядзець нумары «Звязды». Каб ведалі наогул, што гэта, калі не бачылі раней.

Як гром сярод яснага неба прагучала пытанне наконт таго, як выглядае будынак, у якім знаходзіцца рэдакцыя. У інтэрнэце фота Дома прэсы не знайшлі, але школьнікі не разгубіліся і пачалі імправізаваць. Намалявалі кветкі, зорку, мішак, зайчыка, саву, нейкага сучаснага папулярнага героя коміксаў. Потым успомнілі пра астралагічны сімвал года — пеўня. І ён упрыгожыў «асфальтавае палатно». Напісалі пажаданні квітнець далей... Надпіс «Юбілей вачамі моладзі» стаў імправізаванай назвай выстаўкі, якая стварылася. Аўтары радаваліся сувенірам ад «Звязды». Здзівіліся, што атрымалі ўсе і аднолькавыя.

### ПРА БУЛЬБУ І...

Акцыя стала адным з мерапрыемстваў лагернай змены. Яна доўжылася з 1 па 26 чэрвеня. Паводле слоў **дырэктара школы Ірыны ШУШКЕВІЧ**, педагогі стараюцца, каб праграма была разнастайнай.

— Яе распрацоўка пачынаецца ўжо пасля завяршэння змены. Улічваем пажаданні дзяцей, калі праводзім анкетаванне і гутарым з імі. Карэкціруем адпаведныя планы, — тлумачыць яна.

Старэйшыя школьнікі, у прыватнасці, ахвотна бяруць удзел у забаўляльных і спартыўных мерапрыемствах. Для іх арганізуюцца экскурсіі і турыстычныя спаборніцтвы. Дзеці, напрыклад, вучацца спартыўнаму арыентаванню, вязанню турыстычных вузлоў, устанаўліваюць палаткі, пераадольваюць палосы перашкод.

Дарэчы, падчас выправаванняў педагогі заўважылі, што падлеткі не ўмеюць чысціць бульбу. Вырашылі гэтаму навучыць тых, хто будзе ў лагеры ў наступным годзе.

У пойме ракі Віцьба ў школьнікаў свая экалагічная сцежка. Вывучаюць прыроду, асэнсоўваюць, што яе трэба берагчы.

Праводзяць і творчыя конкурсы: прыдумваюць і абараняюць «візітныя карткі» сваіх груп, гуляюць у КВЗ, рыхтуюць прадстаўленні тэатра мініяцюр. З задавальненнем ствараюць газеты, інфармацыйныя бюлетэні ў форме коміксаў...

Практыкуецца падчас змен шэфства старэйшых школьнікаў над малодшымі. Дырэктар ганарыцца, што ў выніку часовыя памочнікі выкладчыкаў становяцца настаўнікамі. А раней і не адчувалі ў сабе педагагічнага прызвання.

У апошнія гады складана ўладкоўваць падлеткаў са школьнага лагера на працу. Бывае, дапамагаюць бацькі, шэфы. З бюджэту перыядычна вылучаюцца грошы на аплату работ па зборцы, рамонце школьнай мэблі.

Сёлета школе споўніцца 76 гадоў. На сёння ў яе спісе 780 вучняў. Набор у 1-ы клас працягваецца.

### ПА ЯБЛЫКІ Ў ШКОЛУ

Ад іншых віцебская сярэдняя школа №29 імя В. В. Піменава адрозніваецца цудоўным садам. У 1963-м з Лосвідскага лясніцтва прывезлі сюды саджанцы. Каля 40 дрэў да гэтага часу даюць добры ўраджай. І з дазволу кіраўніцтва яблыкі розных сартоў могуць браць усе ахвотныя.

У 1974 годзе ў школе стварылі цымбальны аркестр, які пазней атрымаў званне ўзорнага. І на працягу многіх гадоў пацвярджае гэта. Асноўны рэпертуар — народныя мелодыі.

У 1998-м СШ №29 стала «эксперыментальнай пляцоўкай». Тут апрабавалі мадэль сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з 12-гадовым тэрмінам навучання. У эксперыменце ўдзельнічалі 416 вучняў і 39 настаўнікаў.

Педкалектыў адным з першых у рэспубліцы перайшоў на 10-бальную сістэму ацэнкі ведаў.

Тут вучыліся будучыя знакамітыя спартсмены, навукоўцы, урачы, мастакі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

## ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 27 июля 2017 года на 10-м открытом аукционе проводит 4-й от 13 апреля 2017 года повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел.руб.) | Сумма задатка (бел.руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 37 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ (демилитаризованное) №498205003 дв. 39346 1982 г. 4 кат. 4601 км 304 м/ч | г. Минск, в/ч 63755 | 38 000 | 3 800 |
| 38 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ (демилитаризованное) №498301002 дв. 791472 1983 г. 4 кат. 647 км 3,25 м/ч | г. Минск, в/ч 63755 | 38 000 | 3 800 |

**Аукцион** состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **27 июля 2017 г. в 11.00.**
К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 24 июля 2017 года**.
Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **27 июля 2017 г. с 9.00 до 9.45.**
**Победитель аукциона обязан:**
1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.
Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29, код 153001739, российские рубли – р/с 3012107883087 в Центре банковских услуг №701, ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 369, УНН 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**.

**Справки по тел. (017) 398 07 81,**
**факс (017) 398 07 81.**
**Наш адрес в Интернете:**
**www.bsk.by, auk@bsk.by.**

Ранее опубликованное извещение в газете «Звязда» №117 от 22 июня 2017 г.

## Заряд бодрости с утра

Контрастный душ, пробежка, двойной эспрессо... Еще одно средство взбодриться и начать день с хорошего настроения – зубная паста **R.O.C.S. Энергия утра** со вкусом двойной мяты, которая прекрасно освежает, дарит длительное ощущение чистоты и предназначена для постоянного ежедневного использования взрослыми и детьми старше 4 лет.

**R.O.C.S. Энергия утра** обеспечивает высокий уровень комплексной защиты зубов и десен за счет действия БИО-компонентов растительного происхождения, активность которых сохраняется благодаря низкотемпературной технологии приготовления зубной пасты.

Комплекс MINERALIN ®, который состоит из натурального фермента бромелаина, ксилита и минеральных соединений – источников ионов кальция, фосфора и магния, – обеспечивает выраженный эффект от применения:

- Осветление эмали зубов и придание ей блеска
- Укрепление твердых тканей зубов и предупреждение развития кариеса
- Длительная чистота зубов и десен
- Предупреждение образования темного налета и зубного камня
- Устранение кровоточивости и воспаления десен
- Свежесть дыхания
- Нормализация состава микрофлоры полости рта и устранение дисбактериоза




УНП 191852370

# Самае важнае — рабіць добрую музыку

**«Песня года Беларусі» — чаканае музычнае свята, якое тэлеканал АНТ ужо другі год запар праводзіць на сцэне летняга амфітэатра ў Маладзечне. Асновай для фарміравання трэк-ліста канцэрта сталі спісы лідараў ратацый, якія падаваліся музычнымі рэдактарамі самых папулярных радыёстанцый Беларусі на працягу паўгода. Такім чынам, разам былі сабраныя лепшыя песні за першае паўгоддзе 2017-га. Тэлевізійную версію праекта можна было ўбачыць у эфіры тэлеканала ў дзень яго 15-годдзя.**



Песні беларускай эстрады цікава паслухаць. Але, прызнацца, не заўсёды чакаеш пачуць штосьці новае і адметнае. У гэтым сэнсе «Песня года — 2017» стала сапраўдным адкрыццём. Такой колькасці добрых хітоў ніяк не чакалася. Цікава і тое, што некаторыя папулярныя артысты выконвалі новыя кампазіцыі на беларускай мове.

## «Час стварэння новай ментальнасці»

Калі на сцэну выйшаў неверагодна стыльны Uzari, колішні прадстаўнік Беларусі на «Еўрабачанні», і пачаў вельмі яскрава выконваць песню «Я выдумляю», больш сядзець на месцы я не змагла: зразумела, што трэба тэрмінова ісці за сцэну, каб пагутарыць з выканаўцам. Як высветлілася, Uzari ўсё часцей і часцей выкарыстоўвае беларускую мову ў сваёй творчасці.



— Час прыйшоў. Я вырашыў размаўляць на мове, вывучаць яе, успомніць словы, бо ў кожным беларусе яны жывыя. Калі мы пачынаем размаўляць на мове, тады мова размаўляе з намі, — распавёў карэспандэнту «Звязды» **Юрый НАЎРОЦКІ, ён жа Uzari.** — Я вырашыў пісаць песні менавіта па-беларуску. Прычым мова павінна гучаць не ў папсовых камерцыйных творах. Трэба рабіць на ёй музыку, якая будзе працаваць на нашых дзяцей. Спачатку я напісаў песню «Мора», затым «Я выдумляю», — і яна сканцэнтравала ўсе мае добрыя пачуцці. Песня нарадзілася адразу, прыйшла ў адно імгненне, я вельмі ўдзячны Мікіту Найдзёнаву за кранальны тэкст... Менавіта сёння час мовы, пачатак стварэння новай ментальнасці Беларусі. Я разумею, што, калі я не пачну рабіць гэта, то мае думкі нічога не вартыя... Адметна, што сёлетнія ўдзельнікі «Еўрабачання» спявалі па-беларуску. Увогуле ж кожны артыст, які прадстаўляў нашу краіну на гэтым конкурсе, рабіў пэўны новы крок. Хтосьці выходзіў у шыкоўнай сукенцы, іншы выдатна танчыў, нехта дэманстраваў, што мы можам выдатна спяваць па-англійску... Я, выступаючы пасля Тэо, вырашыў адмовіцца ад усіх шоу, ад усіх спецэфектаў. А сёлета мы паказалі, што можам быць з роднай мовай.. Я вельмі б хацеў, каб наступныя ўдзельнікі «Еўрабачання» таксама імкнуліся спяваць па-беларуску.

Uzari лічаць яскравым прадстаўніком новай папулярнай беларускай музыкі. Але спявак адзначае, што гэтым заняткам асаблівых грошай сёння не заробіш: варта проста імкнуцца рабіць добрую музыку. На яго думку, магчыма, нашы дзеці, унукі, змогуць шырэй разгарнуцца на музычным алімпе.

У многім салідарная з Uzari і Юлія Глебава, якая выканала поп-рокавую кампазіцыю «Малюй», выкарыстаўшы яшчэ і цымбалы.

— Сёлета ў нас выйшаў альбом, у якім палова песень — беларускамоўныя. У адрозненне ад папярэдняга альбома, гэта істотная змена для нас і, можна сказаць, дасягненне. Мы хочам рухацца і далей у кірунку большай колькасці беларускамоўных песень, — гаворыць **Юлія ГЛЕБАВА**. — Да гэтага ў нас было жаданне зрабіць беларускамоўны альбом, але, скажу шчыра, мы пабойваліся рэакцыі публікі, бо здаралася ўсякае. Таму, адчуўшы аддачу ад гэтай песні, мы надзвычай узрадаваліся.



Песня «Малюй», якую Глебава выконвала на «Песні года», ёй аднойчы прыснілася. Яна ўбачыла ў сне рукі цымбаліста, што іграюць пэўны цымбальны рытм, кавалак запеву — і іх уключылі ў песню. Песня сапраўды быццам прыйшла з нябёсаў. Усё невыпадкова, упэўнена Глебава, гэта пэўны знак, і трэба рухацца далей. Песню аўтарка напісала разам з мужам Аляксеем Глебавым.

Спявачка распавяла, што ёй нярэдка перад абуджэннем прыходзяць матывы песень. Тут галоўнае не разгубіцца, калі расплюшчваеш вочы, адразу іх занатаваць. Інакш прыгожыя матывы могуць проста растварыцца.

## «Няма нічога больш вясёлага...»?

Саша Нэма, Аляксей Хлястоў, Іна Афанасьева, Георгій Калдун, Галіна Шышкова — любімыя беларускія артысты таксама прадставілі ў гэты дзень надзвычай яскравыя новыя песні. Радуе тое, што ў беларускай музыцы запамінальны матыў, лёгкія, кранальныя тэксты.

Надзвычай горача публіка прыняла выступ Ядвігі Паплаўскай. Нагадаем, што сёлета сышоў з жыцця яе муж спявак Аляксандр Ціхановіч. Таму гледачы ў знак спачування і салідарнасці апладзіравалі спявачцы стоячы. Паплаўская выканала пранікнёную песню «Как я люблю», а напрыканцы дадала: «Ваша Ядвіга. І, вядома. Саша».

Анатоль Ярмоленка выйшаў на сцэну разам са сваім унукам, таксама Анатолем Ярмоленкам, і Алесяй — атрымаўся сямейны творчы тандэм.

Гурт «Дразды» — вакальна-інструментальна-танцавальна-гумарыстычны ансамбль, як іх прадставілі, — выканаў надзвычай драйвовую песню. «Звычайна мы спяваем вясёлыя песні. Але няма нічога больш вясёлага, чым светлы сум. Улюбляюся. Паехалі», — сказаў саліст Віталь Карпанаў. І дадаў, што ён звычайны хлопец з вёскі Сівіца Валожынскага раёна, на што зала адрэагавала надзвычай узрадавана.

Бурныя авацыі, спевы ў зале выклікала выступленне **Аляксандра САЛАДУХІ**. Ён падзяліўся з карэспандэнтам «Звязды» сваімі думкамі пра творчы шлях і славу:

— Публіка шмат гадоў надзвычай добра прымае мяне ў многіх гарадах Беларусі. Я хачу падзякаваць усім слухачам, якія прыходзяць на мае канцэрты ўжо 30 гадоў. Сёлета я адзначыў два грандыёзныя юбілеі: 30 гадоў на сцэне, у першы дзень вясны, а таксама ў той жа дзень чвэрць стагоддзя споўнілася майму хіту «Здравствуй, чужая милая». На «Песні года» я выканаў песню з новага, 11-га майго сольнага альбома, які называецца «Мы будем вместе», па аднайменнай песні. З прэзентацыяй альбома я выпраўлюся ў тур па Беларусі і планую наведаць каля 100 гарадоў... У мяне ёсць хіты на беларускай мове — «Заварожаная фея» — надзвычай прыгожая песня Алега Елісеенкава на вершы Алеся Бадака, а таксама песні «Каралева зімы», «Я не вярнуся». Даўно ніхто не прапаноўваў песень па-беларуску — калі б штосьці з'явілася, я з задавальненнем бы выканаў.

**«Я вырашыў размаўляць на мове, вывучаць яе, успомніць словы, бо ў кожным беларусе яны жывыя. Калі мы пачынаем размаўляць на мове, тады мова размаўляе з намі».**

## «Я нібы выцягнуў шчаслівы білет»

Яскравы прадстаўнік маладой генерацыі на «Песні года» — гэта **Ян ЯРАШ**. Часам яго называюць «адкрыццём года». Выканаўца распавёў пра свой шлях да поспеху:

— Маё супрацоўніцтва з тэлеканалам АНТ пачалося з тэлевізійнага праекта «Легенды. Live», дзе я працаваў сесіённым музыкантам і іграў з многімі артыстамі. У той час я працаваў, пэўна, з сямю беларускімі гуртамі, шмат дзе мільгаў як клавішнік. Але мне хацелася рабіць нешта сваё. Тады я падаў заяўку на конкурс «Акадэмія талентаў». І ён стаў маім адпраўным пунктам — я паверыў у сябе як у вакаліста і пачаў рабіць уласную музыку. Менавіта пасля гэтага конкурсу мае песні сталі займаць лідзіруючыя радкі хіт-парадаў. Таксама я ўдзельнічаў ва ўкраінскім шоу «Голас» — там пасупрацоўнічаў са Святаславам Вакарчуком і Патапам. Такое адчуванне, нібы выцягнуў шчаслівы білет: са мной працавалі найлепшыя музыкі. Я не буду спыняцца на тым, чаго дасягнуў, бо ў жыцці самае важнае — рабіць тое, чаго ты хочаш, а што з гэтага атрымаецца — трэцяя справа. Галоўнае — быць шчырым перад самім сабой. Песню «Блізка» я напісаў у суаўтарстве з Максімам Гетманам і Данілам Яцэвічам. Дарэчы, я займаюся не толькі інструментальнай, але і электроннай музыкай (мы вырашылі раздзяліць гэтыя два кірункі), у апошнім мяне актыўна падтрымлівае «Дэнман прадакшн».

Бразільскія матывы гурта «Без білета», сонечны, летні настрой Napoli, рамантычны дуэт Тэа і Вольгі Рыжыкавай — усе фарбы лепшай эстраднай музыкі былі прадстаўлены на адной сцэне. Завяршыў канцэрт любімец публікі дуэт Navi. Можна з упэўненасцю сказаць, што будучыня ў беларускай эстрады ёсць. І яна нас яшчэ не раз прыемна здзівіць.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
nina@zviazda.by

*г. Маладзечна.*

■ Тэлесеткі

# БАРОМЕТР ПАКАЗВАЕ «ЯСНА»



**Усё ж надвор'е — тэма не толькі вечная, але і карысная. Вось так пачуеш у адной са сталічных кавярняў абмеркаванне лета, прыглядзішся — а гэта Дзмітрый КАРАСЬ запісвае чарговы выпуск «Тэлебарометра».**

Праграма, якая даўно ператварылася з метэапрагнозу на тыдзень у калейдаскоп цікавых навін і фактаў, — адзін са старажылаў айчыннага ТБ, бо сёлета «Тэлебарометр» адзначыў 20-годдзе. Але, запэўнівае творчая група, з цягам часу тэм для размоў менш не стала: «Гэта толькі здаецца, што пра беларускі клімат мы ўсё ведаем — штораз здараюцца цікавыя адкрыцці».

Прыслухоўваюся, пра што распавядаюць госці чарговага выпуску праграмы. Напрыклад, кандыдат біялагічных навук з БДПУ Ганна Свірыд расказвае захапляльныя гісторыі пра водарасці, што ў перспектыве змогуць замяніць і хлеб, і масла, вопытныя фларысты вучаць складаць букет «па навуцы», а арганізатар купальскага фэсту «Свята сонца» Васіль Грыбоўскі ўспамінае аб прызабытай ужо варажбе на трыпутніку. Зрэшты, пра гэта і многае іншае гледачы даведаюцца ўжо ў наступную нядзелю.

— Я сам не думаў, што будзе так цікава, — прызнаецца ў перапынку Дзмітрый Карась (ён вядзе «Тэлебарометр» з 2014 года. — **Аўт.**). — Паколькі, набыўшы дом у вёсцы, вельмі часта там бываю, цяпер тэмы надвор'я, прыроды і экалогіі сталі для мяне надзвычай важнымі. Пакуль жыву на два дамы, але мару нарэшце перабрацца ў вёску канчаткова, таму як будучы сельскі жыхар цікаўлюся пасадкамі, доглядам за раслінамі. Пахвалюся: дзякуючы гасцям праграмы ў маім гародзіку растуць 10 кустоў бульбы, з якіх два сарты з'явяцца на прылаўках толькі налета! І хоць дагэтуль не магу запомніць, якімі ўгнаеннямі што апрацоўваць, але лічу гэта не надта патрэбным — няхай лепш ураджай будзе экалагічна чыстым.

***— Як спраўляецеся з роляй жывога метэадаведніка?***

— Пра надвор'е ў мяне цікавяцца пастаянна, — смяецца вядучы. — А яшчэ падыходзяць з пытаннем: «Гэта ж вы пераехалі на вёску?» І я нястомна паўтараю, што гэта не вельмі складана, не вельмі дорага, і нават працы не так шмат, як здаецца. Трэба проста псіхалагічна настроіцца, што ты не выканаеш усё сёння, нешта даробіш заўтра, і атрымліваць асалоду ад вясковага жыцця. Вось я сёлета ўпершыню ўпадабаў прапалку — у дзяцінстве цярпець не мог, а цяпер, напэўна, дарос.

Як і раней, гледачы пільна сочаць за «Тэлебарометрам»: адны дасылаюць фотаздымкі сваіх кветнікаў і градаў, другія дзеляцца прыроднымі назіраннямі і метэапрыкметамі. Асабліва верныя прыхільнікі «разбіраюць па костачках» кожны выпуск і нават прысвячаюць праграме вершы. Творчая група ў адказ стараецца трымаць узровень. Дарэчы, дзелімся прагнозам на будучыню: ужо ў верасні праграма абновіцца: «Тэлебарометр» стане больш глянцавым і, акрамя навін, фактаў, сустрэч з навукоўцамі, прапануе гледачам падборкі «вакол надвор'я» з усяго свету.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
tselyashuk@zviazda.by

# ...ЯШЧЭ РАЗ ПРА ВАЙНУ

Што: **«ДЗЯЎЧЫНКА ШУКАЕ БАЦЬКУ»**
Калі і дзе: **«Беларусь 3», 3 ліпеня ў 8.55 і 14.00**



Кінастужка, знятая ў 1959 годзе рэжысёрам Львом Голубам на кінастудыі «Беларусьфільм», распавядае пра маленькую Аленку — дачку партызанскага камандзіра «бацькі Панаса», якая падчас Вялікай Айчыннай вайны засталася на акупаванай гітлераўцамі тэрыторыі зусім адна. 4-гадовую дзяўчынку выпадкова знайшоў стары ляснік і прынёс у свой схаваны ў лясным гушчары домік, дзе жыў толькі ён ды ўнук-падлетак.

Але наўны стары, не падазраючы пра сваякоў Лены, выпадкова раскрывае месца знаходжання дзяўчынкі гестапаўцам, — і тыя пачынаюць паляванне на малую, каб выкарыстаць яе ў якасці заложніцы...

Дарэчы, у 1960-я гады гэты дзіцячы фільм сабраў некалькі прэстыжных міжнародных кінаўзнагарод, у тым ліку будучай вядомай актрысе Ганне Камянковай — за лепшую дзіцячую ролю.

Што: **«БЛАКАДА»**
Калі і дзе: **8 канал, 3 ліпеня ў 11.00**



Савецкая мастацкая кінаэпапея пра подзвіг ленінградцаў у страшныя блакадныя часы, якую рэжысёр Міхаіл Яршоў здымаў на працягу 1973—1977 гадоў, складалася з чатырох асобных фільмаў: «Лужскі рубеж», «Пулкаўскі мерыдыян», «Ленінградскі метраном» і «Аперацыя «Іскра». Цікавы факт: ленінградцы палічылі сваім святым абавязкам удзельнічаць у масоўцы ў сцэнах умацавання на подступах да горада летам 1941 года — і амаль усё дарослае насельніцтва Ленінграда выйшла капаць акопы.

Сюжэт эпапеі паслядоўна паказвае, якія пралікі ў першыя месяцы вайны дапусціў тэрмінова створаны Надзвычайны штаб абароны горада, і асобна Клімент Варашылаў, як простыя гараджане, праяўляючы бяспрыкладную мужнасць і стойкасць, перажылі 900-дзённую блакаду, і, нарэшце, як у студзені 1943 года блакаду ўдалося прарваць, і паміж Ладажскім возерам і лініяй фронту быў утвораны вузкі сухапутны калідор, дзе прайшла чыгуначная «дарога Перамогі»...

Што: **«ДНЯПРОЎСКІ РУБЕЖ»**
Калі і дзе: **АНТ, 9 ліпеня ў 10.55**



Гэта карціна, знятая рэжысёрам Дзянісам Скварцовым у 2009 годзе, — адна з многіх спроб сучаснікаў асэнсаваць нанова падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Асновай фільма сталі рэальныя падзеі геральчнай абароны Магілёва, так званы Дняпроўскі рубеж, на якім наступленне фашысцкай арміі ўдалося стрымаць ажно на тры тыдні.

Камандзір дывізіі Аляксей Зубаў, закаханая ў яго медсястра Зоя Сінцова, «правяраючыя» з НКУС і генерал, які ў апошні момант выратоўвае салдата-беларуса ад расстрэлу, кадравыя афіцэры і юныя знішчальнікі танкаў, якія выходзілі супраць машын з бутэлькамі з гаручай сумессю, — на Дняпроўскім рубяжы перамешалася мноства падзей і лёсаў...

## Панядзелак, 3 ліпеня

### Беларусь 1

**6.20 Маст. фільм «У бой ідуць адны «старыя». (12+).**
**8.00, 11.30** «Дзень Незалежнасці». Інфармацыйны канал.
**9.55** Ваенны парад і святочнае шэсце, прысвечаныя Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дню Рэспублікі).
**12.15, 22.40 Драма «Брэсцкая крэпасць». (12+).**
**14.30** «Слаўся, зямлі нашай светлае імя». Патрыятычная акцыя Белтэлерадыёкампаніі.
**15.00, 17.00** Навіны.
**15.25** Спецыяльны рэпартаж.
**16.00, 17.20 Баявік «Аперацыя «Гаргона». (16+).**
**20.00** Панарама.
**20.50** Спецыяльны рэпартаж «Палац Незалежнасці».
**21.00** Ваенны парад і святочнае шэсце, прысвечаныя Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дню Рэспублікі). Тэлеверсія.

### Беларусь 2

**7.05, 18.35, 23.15** Тэлебарометр.
**7.10** «Партызаны». Дак. фільм. (12+).
**8.00, 20.10, 21.45 Кінааповесць «... А золкі тут ціхія». (12+).**
**10.55** Анімацыйны фільм «Кунг-фу Панда». (6+).
**12.25** Анімацыйны фільм «Кунг-фу Панда-2». (6+).
**13.50** Рэпарцёр. (16+).
**14.40 Драма «Старое ружжо». 1—4-я серыі. (12+).**
**19.15** Суперлато.
**21.40** КЕНО.
**23.20 Фантастыка «Трансформеры: эпоха вынішчэння». (12+).**

### Беларусь 3

**7.15, 12.40, 20.15** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**7.30, 12.55, 20.30, 22.45** «Гэты дзень».
**7.35** «Беларуская кухня». Грыбны квас.
**8.05** Канцэрт ансамбля народнай музыкі «Бяседа».
**8.55, 14.00 «Дзяўчынка шукае бацьку». Драма. (6+).**
**10.25 «Вазьму твой боль». Драма. (12+).**
**11.45** «Майстры і куміры». Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Іван Мацкевіч.
**13.00** «Крылы». Канцэрт вакальнай групы «Камерата».
**15.30 «Смяротная схватка». Драма. 1—4-я серыі. (12+).**
**18.30** «Маладзечна-2017». Канцэрт, прысвечаны 45-годдзю Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля «Сябры».
**20.40** «Калыханка». (0+).
**21.05 «Гадзіннік спыніўся апоўначы». Кінааповесць. (12+).**
**22.50** Гала-канцэрт XX тэлевізійнага фестывалю армейскай песні «Звязда».

### Беларусь 5

**8.00** Футбол. Кубак канфедэрацый. Фінал.
**10.10** Пляжны футбол. Кубак Дружбы. Беларусь — Турцыя.
**11.25** Фактар сілы.
**11.55** Пляжны футбол. Кубак Дружбы. Беларусь — Азербайджан.
**13.10** Куды сыходзяць чэмпіёны. Спецыяльны рэпартаж.
**13.30** Тэніс. Уімблдон.
**21.35** Спорт-цэнтр.
**21.45** Час футбола.
**22.30** Змяшаныя адзінаборствы. UFC.

### АНТ

**7.00** «Наша раніца».
**9.00** (з субцітрамі), **13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі) **20.30** Нашы навіны.
**9.15** «Адваротны адлік». «Палацкі хваляюм. Забыты рубеж».
**9.55** Ваенны парад і святочнае шэсце, прысвечаныя Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дню Рэспублікі).
**11.30 Драма «Чаклун і Румба». (12+).**
**13.20 Серыял «Апошні бой». 16+.**
**16.25 Серыял «Туман». (16+).**
**21.00** Гала-канцэрт рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Беларусь маладая мая...»
**0.20 Маст. фільм «У жніўні 44-га». (12+).**

### СТБ

**6.15** «Міншчына».
**6.25 Камедыя «Пасля кірмашу». (12+).**
**7.30, 9.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.40** «24 гадзіны».
**7.50** «Вялікае снеданне». (12+).
**8.30** «Тыдзень».
**9.40** «Залатая калекцыя беларускай песні». (6+).
**9.55** Ваенны парад і святочнае шэсце, прысвечаныя Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дню Рэспублікі).
**11.30 Камедыя «Белыя Росы». (12+).**
**13.00, 13.50 Маст. фільм «Белыя Росы. Вяртанне». (12+).**
**15.15, 16.55 «Снайпер. Зброя адплаты». Серыял. (12+).**
**18.45, 20.30, 23.25 «Снайпер-2. Тунгус». Серыял. (16+).**
**21.00** Ваенны парад і святочнае шэсце, прысвечаныя Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дню Рэспублікі). Тэлеверсія.
**1.05 Маст. фільм «Інсайт». (12+).**

### МІР

**6.00** М/ф «Маша і Мядзведзь». (0+).
**7.00** Добрай раніцы, свет! (16+).
**8.35** «Няма праблем». (16+).
**10.00** «Цяжар абеду». (12+).
**10.30** «Любімыя акцёры», Уладзімір Гасцюхін. (12+).
**11.00, 13.15 Серыял «Сінія ночы». (12+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.10** Дак. фільм «Сямейныя драмы». (16+).
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2». (16+).**
**19.20, 4.10 Серыял «Закон і парадак».**
**23.10** Святочны канцэрт, прысвечаны Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Трансляцыя з Мінска. (12+).
**1.00 Серыял «Маша ў законе». (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**9.00** «Карціна свету».
**9.55** Ваенны парад і святочнае шэсце, прысвечаныя Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дню Рэспублікі).
**11.40** «Вялікая ўдача». (16+).
**12.30** Ток-шоу «Што адбываецца».
**13.35** «Наша справа». (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.40** «Прамы эфір». (16+).
**17.20 Серыял «Пыльная работа». (16+).**
**19.15, 20.40 Серыял «Тэрмінова ў нумар!» (16+).**
**22.00, 23.10 Серыял «Касатка». (12+).**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Цуд тэхнікі. (6+).
**7.05, 8.05 Серыял «Капкан для Папялушкі». (6+).**
**8.55 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.45** «За гранню».
**10.20 Серыял «Кодэкс гонару». (16+).**
**12.00** Суд прысяжных. (16+).
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05** «Новыя рускія сенсацыі». (16+).
**15.05** «Ты не паверыш!» (16+).
**17.05 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**19.40 Серыял «Глухар». (16+).**
**23.00** «Вынікі дня».
**23.30 Серыял «Сведкі». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 16.00, 19.00, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** М/ф «Кумба».
**8.25 Серыял «Выратаваць боса».**
**9.15 Камедыя «Фанфан — водар кахання».**
**10.45** «Сябры дзядулі Марка».
**11.00 Маст. фільм «Блакада», 1—4 серыі.**
**14.35** Дак. фільм «Выратаваць планету».
**16.05** «Мультпарад». «Тайна Сухаравай вежы».
**16.30 Серыял «Прынц і я».**
**18.15 Серыял «Паміж намі кажучы».**
**19.05 Серыял «Падземка».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Маст. фільм «Жамчужына Ніла».**
**23.00 Серыял «Тыран».**

### ВТБ

**6.00** Скетч-шоу «6 кадраў». (16+).
**7.00, 2.25** «Ералаш». (0+).
**8.30** М/ф «Егіптус». (0+).
**9.00, 3.00** М/ф «Тры каты». (0+).
**9.20, 3.20** М/ф «Фіксікі». (0+).
**9.40, 3.40** М/ф «Маша і Мядзведзь». (0+).
**10.00** Камедыя «Бунт вушастых». (12+).
**11.50** Фантастыка «Трансформеры». (12+).
**14.40** Фантастыка «Трансформеры: помста паўшых». (12+).
**17.40** Фантастыка «Трансформеры: цёмны бок Месяца». (12+).
**20.40** Фантастыка «Трансформеры: эпоха вынішчэння». (12+).
**23.50** «Уральскія пельмені». (16+).
**0.50** Драма «Кампенсацыя». (12+).
**4.00** «Лаві момант». (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі». (16+).

### Культура

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.20** Навіны культуры.
**10.15, 1.40** «Назіральнік».
**11.15,18.00, 23.10** Кінапаэзія. Аляксей Кортнеў чытае ўрывак з верша Аляксандра Пушкіна «19 кастрычніка».
**11.20, 21.40** «Каломба». Серыял.
**12.40** «Лінія жыцця». Сяргей Лук'яненка.
**13.30** «Геніі. Сяргей Пракоф'еў».
**14.25** «Марафон Пракоф'ева».
**15.10** 80 гадоў Тому Стопарду. «Бераг утопіі». Гісторыя аднаго спектакля.
**15.50** «Безназоўная зорка». Маст. фільм.
**18.15** «Мой Шастаковіч».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**20.25** Ступені цывілізацыі. «Ключ да разгадкі старажытных скарбаў». Дак. серыял.
**21.10** «Дачка філосафа Шпета». Дак. серыял. Фільм 1-ы.
**23.35** Мастсавет.
**23.40** «Кінескоп». 39-ы Маскоўскі міжнародны кінафестываль.
**0.20** «Вечны кліч». Серыял. 1-я серыя.
**1.25** Сусветныя скарбы.
**2.40** Джавані Соліма, Ваган Марціросян і сімфанічны аркестр Масквы «Руская філармонія».

### Настальгія

**6.00, 0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1959. 2009 год. (16+).
**7.15** Дак. фільм «Навіны дня. Хроніка нашых дзён». (12+).
**7.25, 8.45, 11.10, 17.05, 18.55, 20.30, 21.40, 23.00, 23.35, 2.45, 3.40, 5.00** Музычная настальгія. (12+).
**7.40, 1.15** Маст. фільм «Д'Артаньян і тры мушкецёры». (16+).
**9.00** «Быў час». 2009 год. (16+).
**10.00** Маст. фільм «Камічны палюбоўнік, або Любоўныя задумы сэра Джона Фальстафа». (16+).
**11.40, 23.30** «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма. (16+).
**12.00** «Акулы пяра». «Начныя клубы Масквы». 1995 год. (18+).
**12.45** «Праграма «А». 1989 год. (16+).
**14.35** Праграма «Тэма» з У. Лісцьевым: «Свабоднае каханне». 1992 год. (18+).
**15.25** «Ранішняя пошта». «Розныя думкі». 1986 год. (12+).
**16.00** «Пра ката...» Маст. фільм. (16+).
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «А.В.П.-студыя». 2005 год. (18+).
**19.20** Маст. фільм «Прыгоды Электроніка». 1-я серыя. (12+).
**20.40** Дак. фільм «Мода 89—90». (12+).
**21.00, 3.00** «Мінулы час». (12+).
**22.00** «Народжаныя ў СССР». (12+).
**4.00** «Колба часу». (16+).
**5.30** Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі». (16+).

### EuroSport 1

**4.00, 7.00** Тэніс. Турнір АТР. Фінал.
**5.30, 9.30, 13.15, 2.30** Веласпорт. «Тур дэ Франс».
**8.00, 18.45, 1.15** Футбол. Юнацкі чэмпіянат Еўропы (U-19).
**10.55** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй». Ліндсі Вон.
**11.00** Стральба з лука. Кубак свету.
**11.30** Футбол. «ФІФА».
**12.00, 22.00, 0.20** Веласпорт. «Тур дэ Франс» з Грэгам Лемондам.
**13.00, 18.30** Веласпорт. «Тур дэ Франс»-экстра.
**21.05** Снукер. Кубак свету.
**23.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**0.00** Watts.

### Кінакамедыя

**1.55** Камедыя «Вялікае вяселле». (16+).
**3.35** Камедыя «10 дзён, каб закахацца». (16+).
**5.20** Прыгоды «Вікі». (16+).
**6.55** Камедыя «Дзеці сексу не перашкода». (16+).
**8.50** Камедыя «Што вытвараюць мужчыны!-2». (18+).
**10.25** Камедыя «Больш, чым жыццё». (0+).
**12.05** Камедыя «Беласнежка: помста гномаў». (12+).
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)». (16+).
**16.15** Меладрама «Як выйсці замуж за мільянера». (12+).
**18.00** Камедыя «Памятаю — не памятаю». (12+).
**19.30** Меладрама «Мая вялікая іспанская сям'я». (16+).
**21.20** Камедыя «Канікулы мары». (12+).
**23.05** Камедыя «Глыток». (18+).

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.10** «10 самых». (16+).
**10.40** «Асцярожна, махляры!» (16+).
**11.15** «Без падману». (16+).
**12.05** «Тайны нашага кіно. «Месца сустрэчы змяніць нельга».
**12.35, 15.10, 17.50** «Месца сустрэчы змяніць нельга». Дэтэктыў. (12+).
**19.30, 2.55** «Я дачакаюся...» Маст. фільм. (16+).
**22.50** «Вокладка». (16+).
**23.20** «Звышнатуральнае». Серыял. (16+).
**0.05** «Патрашыцелі». Трылер. (16+).
**2.00** «Ежа, я люблю цябе». (16+).
**16.10** Сатысфакцыя. (16+).
**18.10** Мечаносец. (16+).
**20.20** Уцячы, дагнаць, закахацца. (12+).
**22.10** No Comment. (16+).
**0.20** Тры дзяўчыны. (16+).
**2.20** Бармэн. (16+).
**4.20** Ванечка. (16+).

### ТБ1000

**6.10** Бачнасць гневу. (16+).
**8.35** Паляўнічыя на троляў. (16+).
**10.45** Сетка. (16+).
**13.05** Маска. (12+).
**15.15** Твары ў натоўпе. (16+).
**17.15** Розум і пачуцці. (12+).
**20.10** Джэры Магуаер. (16+).
**23.00** Апошні самурай. (16+).
**2.00** Сёстры Магдаліны. (16+).
**4.10** Аднакласнікі. (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Масква, я люблю цябе! (16+).
**8.25** Прывід. (6+).
**10.35** Хто я? (16+).
**12.20** Брыльянты для дыктатуры пралетарыяту. (16+).
**14.20** Кампенсацыя. (16+).

### National Geographic

**6.00, 13.25** Гульні розуму. (12+).
**6.45, 14.10** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.55, 10.15, 14.55** Мегазаводы. (12+).
**8.40, 11.00, 15.40** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**9.30** Асушыць акіян. (12+).
**11.45, 16.25, 18.45, 0.10, 2.40** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**12.30, 1.45** Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам. (12+).
**17.10, 23.25, 3.25** Секунды да катастрофы. (16+).
**18.00, 21.00, 0.55, 4.15** Прарыў. (12+).
**20.15** Аўта-SOS. (12+).
**21.50, 5.10** Пачатак. (12+).
**22.35** Ліхтугі за мяжой. (16+).

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Зорнае выжыванне. (16+).
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена? (12+).
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена? (12+).
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі. (12+).
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады. (16+).
**11.00** Гульня на жыццё. (12+).
**17.00, 22.00, 6.20** Махінатары. (12+).
**18.00, 1.00** Як працуюць машыны. (12+).
**19.00, 2.00** Голыя і напалохныя. (16+).
**20.00, 2.55** Аляска: сям'я з лесу. (16+).
**4.40** Маланкавыя катастрофы. (16+).

■ Незабыўнае

# ДЗЕ ЁСЦЬ ПАМЯЦЬ, ТАМ БУДЗЕ І ЖЫЦЦЁ

**Калісьці ў Бярэзінскім раёне, што на Міншчыне, была вёска з назвай Жабаўка. У 1964 годзе яе перайменавалі ў Партызанку. І гэта невыпадкова. Падчас Вялікай Айчыннай вайны населены пункт уваходзіў у Клічаўскую партызанскую зону — адну з самых буйных у Магілёўскай вобласці.**

За чатыры гады немцы пяць разоў ладзілі тут карныя аперацыі. На барацьбу з народнымі мсціўцамі з фронту перакідваліся дывізіі, батальёны, зону літаральна палівалі мінамётным, артылерыйскім агнём, бамбілі, мірных жыхароў расстрэльвалі, але яны ўсё роўна дапамагалі партызанам чым маглі, — расказвае **Якаў ПАДДУБСКІ**.

Якаву Фёдаравічу на той час было трынаццаць гадоў і жыў ён разам з бацькамі, сёстрамі і братам у Жабаўцы.

— Да нас часта заходзілі партызаны, дагэтуль помню, як дапамагаў ім насіць дровы ў лазню, як нас, малых, частаваў партызан Вінаградаў. Бываў у нас і камандзір 120-га партызанскага атрада Кандрат Бараноў.

Бацька Якава Паддубскага — Фёдар Рыгоравіч — інвалід Першай сусветнай вайны, непасрэдна ў партызанскім руху не ўдзельнічаў, але рамантаваў зброю, вадзіў партызанаў патаемнымі сцежкамі на заданні, паколькі добра ведаў тутэйшыя мясціны. А маці з сястрой пяклі хлеб для народных мсціўцаў.




У хаце Паддубскіх праходзіла падпольная канферэнцыя Бярэзінскага райкама КПБ(б) 5 лістапада 1942 года. На яе сабралася шмат людзей на конях, падводах. Пра што там гаварылі, юнак не ведаў, бо яго выставілі на вуліцу. Як сведчаць дакументы, на ёй было прынятае рашэнне аб стварэнні Магілёўскага падпольнага абкама партыі.

У лютым 1944 года фашысты спалілі Жабаўку, у якой на той час налічвалася 12 двароў. Людзі вымушаны былі жыць у зямлянках, мерзлі, галадалі. Гэтыя жудасныя старонкі гісторыі назаўсёды засталіся ў памяці Якава Фёдаравіча.

У мірны час Партызанка паступова пусцела і ў 1985 годзе знікла з карты раёна. За два кіламетры ад былога населенага пункта ўстаноўлена стэла ў гонар першай падпольнай канферэнцыі Бярэзінскага райкама КПБ(б). Тут жа знаходзіцца і брацкая магіла з помнікам, дзе пахаваны 20 партызан і дэсантнікаў. Упершыню помнік паставілі ў 1975 годзе, у 2012-м яго замянілі на новы. Як і на папярэднім, на ім выбіты толькі дзевяць прозвішчаў загінулых.

— Чаму тут не пазначаны прозвішчы астатніх, занесеных у раённую кнігу «Памяць»? — хвалюецца суразмоўца.

У Кнізе «Памяць. Бярэзінскі раён» сапраўды пазначаны 11 прозвішчаў. Аднак дакладна не вядома, ці сапраўды ўсе яны пахаваныя ў Партызанцы. Калі ўладкоўвалі помнік, то апытвалі мясцовых жыхароў. З іх дапамогай удалося высветліць толькі прозвішчы дзевяці патрыётаў, растлумачылі ў райвыканкаме. Хутчэй за ўсё тут пахаваны разведчыкі і дэсантнікі, якіх закідвалі самалётам у тыл ворага ў складзе груп. Як вядома, пры жыцці іх прозвішчы былі засакрэчаны.

Акрамя таго, Якаў Фёдаравіч хвалюецца, што пахаванне знаходзіцца ў лесе і праз гады прыйдзе ў заняпад. Дзіця ваеннага ліхалецця прапануе перанесці астанкі воінаў і партызан у суседнюю вёску Галынка або ў райцэнтр.

Прыклады перазахавання ў раёне ёсць. Але такое рашэнне было выклікана аб'ектыўнымі прычынамі. У прыватнасці, каля Магілёўскай шашы стаяў помнік загінулым пры вызваленні Беразіна воінам. Калі пашыралі трасу, то іх астанкі перапахавалі ў іншым месцы. Наогул жа паводле інструкцыі, зацверджанай Міністэрствам абароны, воінскія пахаванні і пахаванні ахвяр вайны могуць быць перанесены ў тым выпадку, калі ім пагражаюць пастаяннае затапленне, апоўзні, наступствы прыроднага і тэхнагеннага характару. Для пераносу гэтага пахавання такіх абгрунтаванняў няма.

Разам з тым, на свае вочы пабачыла, што да мемарыяла ў былой Партызанцы сцежка не зарастае. Кіламетры тры па добрай лясной дарозе — і перада мной паўсталі дагледжаныя магілы, помнікі, абнесеныя пафарбаванай агароджай. Тэрыторыя вакол акуратна прыбраная.

Даглядаюць памятнае месца работнікі Капланецкага сельвыканкама, адкрытага акцыянернага таварыства «Бярэзінскі», Любушанскага лясніцтва, школьнікі. Наведваецца сюды і мясцовы ляснік Міхаіл Гаравік.

Па рашэнні райвыканкама за кожным месцам пахавання воінаў, партызанаў, мірных жыхароў гадоў Вялікай Айчыннай вайны замацаваны канкрэтныя прадпрыемствы, арганізацыі, жыллёва-камунальная гаспадарка раёна, сельскія выканаўчыя камітэты.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■ Простая мова

# СОН У МАЙСКУЮ НОЧ

**...Здавалася: толькі што з'ехалі! І зусім ненадоўга — на лецішчы дзён з дзесяць не былі. А вярнуліся і ўсё, можна сказаць, дом заняты: над дзвярыма, над самым уваходам, «пабудаваліся» ластаўкі. І зараз варта пад'ехаць, варта зашумець, адчыняючы брамку, вылятаюць насустрач, з усіх сілак крычаць: «Вы? Чаго прыперліся?.. Едзьце туды, дзе былі!»**

**А мы б не супраць. Бо там, дзе былі (гэта значыць, ля мора, у водпуску) жылося і насамрэч добра: найлепшая кампанія, сосны, сонца, ровар...**

**Але дома ўсё роўна лепш.**

## ТРОЕ

З дому на працу, з працы дамоў хвілін 40 язды — можна з перасадкамі, можна без, зрэдку — у натоўпе, «на адной назе», трохі часцей, — спакойна седзячы з кнігай ці газетай, што, як высвятляецца, таксама... дрэнна.

— Глянь, як ён вочкі паставіў, — кажа нехта некаму ззаду. — На татку глядзіш? Ну ідзі, ідзі да яго, маленькі наш, пасядзі на каленях... Што — не падабаецца? Хочаш назад да мамкі? Дай я цябе пацалую!

Асцярожна, каб не парушыць гэту ідылію, згортваю газету, іду да дзвярэй трамвая. І ўжо адтуль (бо цікава) азіраюся на сямейку: на тату, на маму, на... рыжага, кудлатага сабачку.

## ВАРТА ПАДЗЯКІ!

...Праязны купіць не забудзеш, каб і хацеў, бо на кожным бойкім скрыжаванні стаіць па шапіку (а недзе і па два), чаргі аніякай...

— Мне на месяц, на тралейбус, — прашу касірку, падаўшы грошы.

Жанчына бярэ іх, прабівае чэк, адлічвае рэшту, складае ўсё ў адмысловы латок...

— Дзякуй вам, — кажу, забіраючы.

— *Спасибо!* — адказвае яна. Памыліўшыся? Ці, можа... не? Можа, тым, хто ў Беларусі гаворыць па-беларуску, і сапраўды пара ўжо дзякаваць?

## БЫЎ БЫ ХЛЕБ...

Спроба апытання: «Дзяўчаты, хто-небудзь сустракаўся з мужчынам старэйшага ўзросту? Як гэта? Якія будуць парады?» — «Толькі адна: пенсія ў іх — пасля 10-га»...

— А як у вайскоўцаў, — дык яшчэ і немалая.

Дзед Віця (яму, як кажа, васьмідзясяты *пабег*) надоечы хадзіў атрымліваць. Па дарозе да банка двух чарнявых прыгажунь заўважыў. А ўжо як назад ішоў (з грашыма) яны яго таксама «прыкмецілі». Падышлі, заўсміхаліся:

— Мужчына, у вас можна спытаць?

Дзед Віця навучаны:

— Не! — сказаў, як адрэзаў. Яшчэ і палку прыўзняў...

А мог бы «падставіць вушы».

## ЧАЛАВЕК СЯРОД ЛЮДЗЕЙ

Мабільнік разумны: з самай раніцы нагадаў, што ў Пятровіча — дзень народзінаў. Трэба, значыць, пазваніць, павіншаваць. І лепш, відаць, у другой палоўцы дня, бо ў першай да яго, як правіла, не прабіцца — начальнік.

Так, на ўсякі выпадак, без надзей на «дазвон» набралі нумар. «Абанент» адгукнуўся тут жа: пазнаў, узрадаваўся, падзякаваў за добрую памяць.

Потым расказаў, што з лютага ўжо не працуе — «на пенсію адправілі». І ўсё, маўляў, як адрэзала — цяпер ні званкоў у яго, ні хадакоў — нікому не патрэбен: маўчыць тэлефон (Прабачце, даслоўна): «Ніводная с... не званіла. Нават сягоння!»

## КАЛІ БЕЗ РАДАСЦІ ЛЮБОЎ...

Суседка ўжо магла б сядзець дома, адпачываць, бо, што называецца, заслужыла. Але ж працуе пакуль, хоча на зубы зарабіць, хоць шанцаў, здаецца, мала, бо плацяць, казала, з гулькін нос. Ды і кантракты працягваюць чыста ўмоўна: з пенсіянерамі — на два месяцы, на квартал, не болей.

— Мы як маладыя цяпер, — тлумачыць жанчына, — яны сыходзяцца ды жывуць, пакуль хто лепшы не падвернецца, а мы так працуем. А ўжо як падвярнуўся, — то выбачай-пасунься: была без роспісаў любоў — разлука будзе без наступстваў.

## ЛЁС

Сталіца, праспект, скрыжаванне, безліч машын і людзей! А таму не дзіўна, што ў гэтай мітусні нехта разгубіўся — як пішуць следчыя, не справіўся з кіраваннем: з'ехаў з праезнай часткі — знёс дрэва.

Яно, дзякаваць Богу, невялікае было, маладое — лёгка загінула.

Калі б на яго месцы расло старое, — загінуў бы чалавек.

## ПАСПЕЎ

Старасці баяцца толькі жанчыны, мужчыны — не паспяваюць, нават спалохацца.

Калега вельмі рана сышоў. І хораша праводзілі: незлічона кветак было, незлічона вянкоў і людзей: радня прыехала, сябры-супрацоўнікі, суседзі...

За чаркай потым успаміналі, «якім ён хлопцам быў», што любіў, што не любіў, казалі, як многа паспеў!

І (не аддзячыць Богу!) што чуў усё гэта сын нябожчыка.

І сынаў сын — таксама!

## ПЫТАННЕ

«...Сядзеш у электрычку, пазвані — я сустрэну цябе», — падрадзіўся сваяк.

Сесці — яшчэ паспела, а вось пазваніць... Ну, не выпала, прынамсі, адразу. Бо следам, за хвілю да адпраўлення, у вагон увалілася жанчына, прыткнулася побач, паставіла сумку, выцерла ўзмакрэлы твар і... слёзы, з адчаем спытала:

— Ну чаму мы такія...

— ?

— ...Нелюдзі. Я з касы толькі што — білет купляла. Кажу там: «Да Маладзечна, адзін, льготны». Мне ў адказ: «Прад'явіце дакумент». «Навошта? — пытаю. — Вам што — майго твару мала? На ім жа напісана: пенсіянерка я, 75 гадоў... Дакументы ў сумцы... Пакуль дастану, каб вам прад'явіць, — электрычка сыдзе». — «Тады, — гаворыць мне дзеўка, — скідкі не будзе, білет прадаю вам за поўны кошт!» І што вы думаеце, — прадала, нават не здрыганулася...

— Ну, яе можна зразумець, — паспрабаваў разважыць жанчыну сусед па лаўцы. — Кожны сёння за работу трымаецца, начальства свайго баіцца. Яно ж за тое, што ты некаму дапамог ці добрую справу зрабіў, прэмію не выпіша, а вось за тое, што ў інструкцыі нейкую літарку парушыў, прачуханца дасць і вокам не міргне! Час такі — жорсткі...

Які ён — такія людзі?

Ці наадварот — якія людзі, такі і час?

Пытанне.

## ПАЖНЕШ ХАРАКТАР

Кватэра з гісторыяй гэта...

Ды любая, відаць, нават новая, бо нехта ж яе будаваў, купляў, абстаўляў... Што ўжо казаць пра старую?

У тую, аднапакаёвую, Наста засялялася адна. І жыла — таксама, прычым досыць доўга: толькі бліжэй да сарака выйшла замуж, пераехала ў новае, мужава жытло.

Старое яны здаюць — як правіла, студэнткам альбо маладым сужэнцам, што, здавалася б, выгадна? Так... Калі б гэта жыллё хоць крыху ды глядзелі. А то ж...

«Чужое», «не маё», значыць, можна карыстацца і пры гэтым не мыць ні вокны, ні пліту з сантэхнікай; не чысціць дываны, не прыбіраць, можна абдзіраць шпалеры і лінолеум. Вось будзе сваё, тады...

Не верыцца, што тады ў гэтых гаспадароў нешта будзе іначай, бо, пасееш прывычку, пажнеш характар, сапсаваны — і сапраўды — па-ранейшаму балючым «кватэрным пытаннем».

## УРОК

Горад. Вуліца. Дзень.

— Ваў, колькі летаў і зім?!

Гэта, здаецца, Васіль? Гадоў з дзесяць не бачыла!

— Можна абняць? — з той радасці пытаецца ён.

— Ну вядома ж! — кажу.

І тут жа заўважаю, што знаёмец... спалохаўся, што ён азірнуўся («як бы хто не заўважыў»?), што замест абдымкаў ледзь крануўся пляча...

Больш, відаць, ніколі не памкнецца з абдымкамі.

Я таксама.

## «ЦВЯТОК РАДЗІМЫ»

Паланга — не Парыж, не сталіца свету, проста мілы, курортны гарадок, з морам, з вялікім Батанічным садам, з музеем бурштыну ў палацы Тышкевіча, з французскімі пахамі кавы-круасанаў, з мноствам кавярняў і віл (вялікіх прыватных дамоў, разлічаных яшчэ і на прыезджых).

Ля кожнай з іх — цікавая прысада-агароджа, дагледжаны сад і газон, «джэнтльменскі набор» — мангал-альтанка-арэлі, прыгожыя клумбы, цяпліцы, камяні-валуны...

Побач з адным — васілёк расцвіў, таксама адзін. Можа, выпадковы, можа, ветрам сюды занесены, бо пустазелінка ж...

А можа, вырасціў хто, сумуючы аб радзіме?

## СОН У МАЙСКУЮ НОЧ

У сяброўкі пісьменніцы Лідзіі Арабей (светлай памяці!) быў адмысловы сшытак, які так і называўся «Мае сны».

У мяне сшытка няма, а сны...

Доўгі, змрочны калідор — без вокнаў, без дзвярэй, без магчымасці збочыць. «Прасвет» — толькі ў канцы — у нейкім вялікім, няўтульным памяшканні, падобным на цэх, з якога адны станкі вынеслі, а другія яшчэ не ўнеслі.

Зрэшты, разглядацца там няма калі, бо насустрач хуткім крокам, з усмешкай ідзе... Мікола — як заўжды, бездакорна чысценькі, як перад... смерцю — схуднелы... Ветла абдымае (чаго ў жыцці ніколі не рабіў), туліць да сябе, кажа, як жа рады! А ўжо як я... Што ён — жывы!.. (Ці гэта я — не...?) Пытаю:

— Ну як вы?.. Дзе ваша Каця?

Адказу чамусьці не чую, але ж вакол нас бачу вазоны — жывыя і засохлыя, шмат... Значыць, Каця Міколава тут (яна вечна нешта садзіла, але мала што даглядала)... А кветак — шкада. Паліць бы... І вокны трэба памыць, адшараваць падлогу.

З гэтаю думкай «выходжу з абдымкаў» — кірую да крана з вадой, знаходжу анучку...

Думала, дзіўны сон.

— Не, — прызнала прыяцелька, — ён якраз-такі лёгка тлумачыцца. Ну па-першае, дурань хоць дзе работу знойдзе. Па-другое, у яго заўсёды праблема з часам — на гэтым свеце яго бракуе, каб падумаць пра той, на тым — не будзе, каб успомніць пра гэты... А «калідор» — ён проста для пераходу. У некага — светлы і кароткі, у некага — цёмны і доўгі. Але прайсці яго павінен кожны: ніхто не збочыць.

І сапраўды.

**Валянціна ДОЎНАР**
*dounar@zviazda.by*

ДЭПАРТАМЕНТ
ПА КАШТОЎНЫХ ПАПЕРАХ
Міністэрства фінансаў
Рэспублікі Беларусь
ЗАВЕРАНА
19 чэрвеня 2017
Прозвішча Сушко С. А.
Подпіс

# КРАТКАЯ
## об эмиссии облигаций открытого для юридических лиц двести двадцать второго, двести двадцать третьего,

**1. Наименование эмитента:**
а) полное наименование:
на белорусском языке – адкрытае акцыянернае таварыства «Белаграпрамбанк»;
на русском языке – открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (далее – Банк);
б) сокращенное наименование:
на белорусском языке – ААТ «Белаграпрамбанк»;
на русском языке – ОАО «Белагропромбанк».

**2. Место нахождения Банка, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**
Местонахождение Банка: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.
Телефон: (017) 229 63 25, факс (017) 229 64 41.
Электронный адрес e-mail: info@belapb.by.
УНП 100693551, ОКПО 00040577.

**3. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность Банка, информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации эмитента либо о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве), о внесенных изменениях в проспект эмиссии облигаций, и сроки их публикации**
Годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность Банка ежегодно публикуется в газетах «Звязда» или «Рэспубліка» в сроки, определенные законодательством Республики Беларусь.
В газете «Звязда» публикуется следующая информация:
- в случае принятия решения о реорганизации или ликвидации Банка – не позднее 2 месяцев с момента принятия такого решения;
- в случае возбуждения в отношении Банка производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) – в течение 5 дней с момента получения соответствующего судебного постановления;
- в случае внесения изменений в проспект эмиссии облигаций – не позднее 7 дней после регистрации указанных изменений Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь.
Кроме того, вышеуказанная отчетность и информация будут размещены на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг в сроки, определенные законодательством Республики Беларусь.

**4. Размер уставного фонда Банка**
Уставный фонд Банка составляет 810 363 504,60 белорусских рублей (восемьсот десять миллионов триста шестьдесят три тысячи пятьсот четыре белорусских рубля, 60 копеек).

**5. Депозитарием, обслуживающим Банк**, является Депозитарий ценных бумаг Банка (адрес: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3), действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выданного Министерством финансов Республики Беларусь, регистрационный номер 02200/5200-1246-1085.

**6. Права владельца и обязанности Банка, удостоверяемые облигацией**
Облигация предоставляет ее владельцу равные объем и сроки осуществления прав вне зависимости от времени приобретения облигации.
Владелец облигации имеет право:
- получать доход по облигации в соответствии с условиями, предусмотренными подпунктом 7.10 пункта 7 настоящего документа;
- получать номинальную стоимость облигации при ее погашении в порядке, предусмотренном подпунктом 7.13 пункта 7 настоящего документа;
- получать номинальную стоимость облигации с выплатой дохода при досрочном погашении облигации, а также в случае признания эмиссии недобросовестной, а выпуска недействительным в порядке, предусмотренном соответственно подпунктами 7.11 и 7.17 пункта 7 настоящего документа;
- свободно распоряжаться облигацией в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Банк обязан:
- выплачивать доход по облигации в порядке и на условиях, предусмотренных подпунктом 7.10 пункта 7 настоящего документа;
- погасить облигацию в порядке, предусмотренном подпунктом 7.13 пункта 7 настоящего документа;
- в случае принятия соответствующего решения досрочно погасить облигацию в порядке, предусмотренном подпунктом 7.11 пункта 7 настоящего документа;
- обеспечить владельцам облигаций возврат денежных средств, полученных в оплату размещенных облигаций, а также причитающийся процентный доход в случае признания эмиссии недобросовестной, а выпуска недействительным в порядке, предусмотренном подпунктом 7.17 пункта 7 настоящего документа.

**7. Сведения о проведении открытой продажи облигаций двести двадцать второго, двести двадцать третьего, двести двадцать четвертого выпусков**

**7.1. Дата принятия и утверждения решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего (утвердившего) это решение**
Решение о двести двадцать втором, двести двадцать третьем, двести двадцать четвертом выпусках облигаций для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей в соответствии с Уставом Банка принято и утверждено Наблюдательным советом Банка 22.05.2017, протокол №13.

**7.2. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям**
Эмиссия облигаций осуществляется по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь при условии, что объем выпусков таких облигаций не превышает размера нормативного капитала Банка (подпункт 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 №277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг»).
По состоянию на 01.05.2017 нормативный капитал Банка составляет 1 287 255,2 тыс. бел. рублей.

**7.3. Цель эмиссии облигаций и направления использования средств, полученных от размещения облигаций**
Эмиссия облигаций осуществляется в целях привлечения денежных средств юридических лиц и индивидуальных предпринимателей.
Привлеченные средства от размещения облигаций будут направлены на фондирование кредитов корпоративным клиентам вне рамок государственных программ.

**7.4. Эмиссия облигаций согласована Национальным банком Республики Беларусь** (постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 31.05.2017 №211).

**7.5. Вид и форма облигаций, объем выпуска, количество, номинальная стоимость облигаций, ставка процентного дохода:**

| Номер выпуска | 222 | 223 | 224 |
|---|---|---|---|
| Вид и форма облигаций | процентные, именные, конвертируемые, в бездокументарной форме | | |
| Валюта выпуска | белорусский рубль | российский рубль | доллар США |
| Объем выпуска, денежных единиц | 30 000 000,00 | 350 000 000,00 | 20 000 000,00 |
| Количество облигаций, шт. | 300 000 | 35 000 | 20 000 |
| Номинальная стоимость облигации | 100,00 | 10 000,00 | 1 000,00 |
